Дзяржаўная ўстанова культуры
"Горацкая раённая бібліятэчная сетка"
Цэнтральная бібліятэка
імя М. Гарэцкага

# Каляндар знамянальных і памятных дат па Горацкаму раёну на 2022 год





Горкі 2021



Дзяржаўная ўстанова культуры
"Горацкая раённая бібліятэчная сетка"

Цэнтральная бібліятэка
імя М. Гарэцкага

Горкі 2021

**Каляндар знамянальных і памятных дат па Горацкаму раёну на 2022 год** / ДУК "Горацкая раённая бібліятэчная сетка", Цэнтральная бібліятэка імя М. Гарэцкага ; складальнік Н. М. Дылькова ; адказны за выпуск І. А. Пачэкіна. – Горкі, 2021. – 35 с.

У календары знамянальных і памятных дат Горацкага раёна на 2022 год прадстаўлены даты, якія адлюстроўваюць важнейшыя падзеі гісторыі, палітычнага, гаспадарчага і культурнага жыцця раёна, дзейнасць знакамітых людзей, звязаных з нашым краем.

Матэрыял размяшчаецца ў храналагічнай паслядоўнасці, кожная дата забяспечана кароткай інфармацыйнай даведкай. У выпадку неўстанаўлення дакладнай даты, інфармацыя пра яе змешчана ў раздзеле "У 2022 годзе таксама спаўняецца".

Пры падрыхтоўцы календара былі выкарыстаны даведачныя выданні і электронныя краязнаўчыя базы даных з фонду Горацкай цэнтральнай бібліятэкі імя М. Гарэцкага.

# Памятныя даты



ААТ “Малочныя горкі”

## 105 год

— з дня заснавання на базе маслазавода саўгаса № 6 ***ААТ “Малочныя горкі”*** (лістапад 1917).


Копцеўская сельская бібліятэка

## 100 год

— з дня заснавання ***Копцеўскай сельскай бібліятэкі*** (1922).

## 90 год

— з дня, калі быў пушчаны ў строй ***Горацкі ільнозавод*** (1932).


ААТ “Горкілён”

## 85 год

— з дня ўтварэння ***аддзела сацыяльнага забеспячэння Горацкага райвыканкама*** (пастанова ЦК КПБ і СНК БССР, 4 лістапада 1937);

— з дня заснавання ***Паршынскай сельскай бібліятэкі*** (1937).


Паршынская сельская бібліятэка

## 75 год

— з дня заснавання ў Беларускім сельскагаспадарчым інстытуце ***факультэта механізацыі*** (1947).



Народнае літататурнае аб'яднанне «Парнас»

## 70 год

— з дня заснавання народнага літаратурнага аб’яднання ***“Парнас”*** пры рэдакцыі газеты БСГА “Савецкі студэнт” (15 кастрычніка 1952);

— з дня заснавання службы аховы (цяпер ***Горацкі аддзел Дэпартамента аховы МУС***, 1952).


Горацкі аддзел Дэпартамента аховы

# Памятныя даты



Красулінская сельская бібліятэка



Універмаг райспажыўсаю-за



Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі



Інтэнат № 3 БДСГА



Паршынскі Цэнтр культуры

**65 год**

— з дня заснавання на базе цагельнага завода ***папраўчай калоніі № 9*** (6 лютага 1957);

— з дня адкрыцця ***Красулінскай сельскай бібліятэкі*** (1 ліпеня 1957);

— з дня адкрыцця ў Горках будынка ***ўнівермага райспажыўсаюза*** (7 ліпеня 1957);

— з дня адкрыцця ***Першага раённага з’езда калгаснікаў*** (30 снеж ня 1957);

— з дня адкрыцця раённага ***Дома піянераў і школьнікаў*** (цяпер ДУДА “Горацкі раённы цэнтр творчасці дзяцей і моладзі”, 1957);

— з дня заснавання Горацкага ***дарожна-рамонтнага будаўнічага ўпраўлення № 127*** (1957);

— з дня здачы ў эксплуатацыю студэнцкага ***інтэрната № 3*** БДСГА на 427 месцаў (1957);

— з дня, калі на базе Ленінскай МТС і чатырох калгасаў зоны гэтай МТС быў ***створаны саўгас “Леніна”.*** Першым дырэктарам стала ***А. А. Новікава*** (1957);

— з дня адкрыцця ***Паршынскага сельскага клуба*** (з 2006 г. Паршынскі Цэнт р культ уры; 1957).

**60 год**

— з дня адкрыцця новага будынка ***Рэкцянскага ФАПа***.

**55 год**

— дня адкрыцця ***сельскіх магазінаў*** у вёсках Рудкаўшчына і Сава (красавік 1967);

# Памятныя даты

— з часу, калі Горацкі філіял Карачаўскага ***завода “Электрадэталь”*** (з 1972 – Горацкі ***машынабудаўнічы завод***, з 1992 – ***ААТ “Прэма”***) пачаў выпускаць першую прадукцыю (чэрвень 1967);

— з дня адкрыцця ў в. Паршына ***помніка воінам-аднавяскоўцам***, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (20 жніўня 1967);

— з дня адкрыцця ў в. Горы ***помніка воінам-аднавяскоўцам***, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (28 кастрычніка 1967);

— з дня перайменавання вуліцы Калгаснай у ***вуліцу імя Ф. І. Кузняцова*** (16 ліст апада 1967);

— з дня рэарганізацыі аддзялення стаматалогіі Горацкай райбальніцы ў ***стаматалагічную паліклініку*** (27 снеж ня 1967 г.);

— з часу, калі на тэрыторыі акадэміі былі ***закладзены парк імя 50-годдзя Вялікага Кастрычніка*** (май 1967) і сквер Інтэрнацыянальнай дружбы (1967);

— з дня адкрыцця ***сельскага магазіна*** ў вёсцы Сенькава (снежань 1967);

— з дня дня стварэння ансамбля ***“Радасць”*** пры БСГА (да 1974 г. – “Брыганціна”; 1967);

— з дня адкрыцця ***першага гарадскога аўтобуснага маршрута “Чыгуначны вакзал – вучгас”*** (1967);

— з часу, калі пачалася забудова ***вёскі Шалаханаўка*** калгаса “Звязда” (1967).



*ААТ “Прэма”*



*Помнік загінуўшым жыхарам в. Паршына*



*Помнік загінуўшым жыхарам в. Горы*



*Стаматалагічная паліклініка*



*Ансамбль “Радасць”*

# Памятныя даты



*Памятнік навуковым супрацоўнікам, студэнтам і служачым БДСГА*



*Помнік загінуўшым жыхарам в. Аўсянка*



*Горацкі райвыканкам*



*Ленінская ДШМиМР*



*Дом быту*

**50 год**

— з дня з дня адкрыцця ***помніка навуковым супрацоўнікам, студэнтам і служачым БДСГА,*** якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (9 мая 1972 г.);

— з дня здачы ў эксплуатацыю ***інтэрната № 9 БСГА*** (ліпень 1972 г.);

— з дня адкрыцця ў калгасе “XVII партз’езд” ***помніка воінам Савецкай Арміі і мірным жыхарам***, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (29 ліпеня 1972 г.);

— з часу, калі быў узведзены ***будынак Горацкага райвыканкама*** (кастрычнік 1972 г.);

— з дня адкрыцця ***музычнай школы ў вёсцы Леніна*** (1972, з 2005 г. – ДзШМіМР).

**45 год**

— з дня адкрыцця ***Дома быту*** па вуліцы Заслонава (1977);

— з дня ўтварэння ***папраўчай установы № 16***, дзе адбываюць пакаранне асобы, якія ўчынілі злачынства па неасцярожнасці (1977);

— з дня ўтварэння ***вайсковай часці МУС Беларусі № 6713***, 2-гі аддзельны стралковы батальён якой дыслацыруецца ў Горках (23 мая 1977).

**40 год**

— з дня, калі згодна Указу Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ***Горкі аднесены да***



*Гасцініца “Проня”*



*Дзіцячы парк*



*Кінатэатр “Крыніца”*



*Гарадскі стадыён*

***катэгорыі гарадоў абласнога падпарадкавання*** (29 кастрычніка 1982);

— з дня здачы ў эксплуатацыю ***гасцініцы “Проня”*** (1982);

— з дня адкрыцця ***дзіцячага парка*** (1982).

**35 год**

— з дня адкрыцця ***кінатэатра “Крыніца”*** (6 студзеня 1987);

— з дня ўтварэння ***Горацкага раённага савета ветэранаў*** (28 лютага 1987);

— з дня здачы ў эксплуатацыю ***інтэрната райаграпрамтэхнікі*** на 250 месцаў (сакавік 1987);

— з дня адкрыцця ***гарадскога стадыёна*** (30 мая 1987 г.);

— з дня адкрыцця дзіцячага аздараўленчага ***лагера “Купалінка”*** (чэрвень 1987);

— з дня адкрыцця ***дзіцячага сада “Церамок”*** (1987);

— з дня прысваення звання “народны”



Народны ансамбль беларускай песні “Быстрыца”


*Аўсянкаўскі сельскі Савет*


*Гімназія № 1*


*Цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва*


*Каменская сярэдняя школа*

ансамблю беларускай песні ***“Быстрыца”*** Горскага сельскага Цэнтра фальклору і народнай творчасці (1987);

— з дня здачы ў эксплуатацыю ***інтэрнатаў ПМК-87 меліяратараў і МПМК-251*** (1987);

— з дня адкрыцця новага ***Дома быту*** па вуліцы Вакзальнай (1987, зараз – гандлёвы цэнтр “Планета”).

**30 год**

— з дня стварэння на базе Любіжскага і Палёнкаўскага сельскіх Саветаў ***Аўсянкаўскага сельскага Савета*** (красавік 1992 г.);

— з дня стварэння на базе сярэдняй школы № 5 ***гімназіі № 1*** (1 верасня 1992);

— з дня адкрыцця ***Цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва*** (25 верасня 1992);

— з дня а адкрыцця ***Каменскай сярэдняй школы*** (28 каст рычніка 1992);

— з дня прысваення звання “народны” ансамблю беларускай песні ***“Весялосць” Маслакоўскага Дома культуры*** (1992);


Народны ансамбль беларускай песні “Весялосць”

— з дня ўтварэння ***раённага Цэнтра культуры*** на базе раённага Дома культуры (21 лістапада 1992);

— з дня стварэння народнага аматарскага аб'яднання ***"Мастацтва"*** пры раённым гісторыка-этнаграфічным музеі (1992).



*Народнае аматарскае аб'яднанне "Мастацтва"*

**25 год**

— з дня адкрыцця ў вучэбным корпусе № 4 БДСГА ***музея-кабінета Максіма Гарэцкага*** (1 кастрычніка 1997);



*Музей-кабінет Максіма Гарэцкага*

— з часу, калі Горацкі вузел паштовай і электрычнай сувязі раздзяліўся на дзве ўстановы – Горацкі вузел паштовай сувязі ***РУП "Белпошта"*** і Горацкі вузел электрычнай сувязі ***РУП "Белтэлекам"*** (1997);



*РУП "Белпошта"*




*РУП "Белтэлекам"*

— з дня стварэння народнага хора ветэранаў вайны і працы ***"Спадчына"*** пры раённым Доме культуры (1997);

— з дня стварэння народнага аматарскага аб'яднання па саломапляценні ***"Скарбніца"*** пры раённым Доме рамёстваў (1997).



*Народнае аматарскае аб'яднанне "Скарбніца"*



Народны хор ветэранаў "Спадчына"


Сонечны гадзіннік


Факультэт бізнесу і права БДСГА


Мемарыяльная дошка П. М. Шарснёву


Копцеўскі сельскі Цэнтр культуры


Горацкі РАУС



Аграгарадок Горы

# Памятныя даты

**20 год**

— з дня, калі у Горках на перакрыжаванні вуліц Якубоўскага і Заслонава ўстаноўлены ***сонечны гадзіннік*** (1 чэрвеня 2002);

— з дня, калі ў Горках пачала працаваць ***сотавая сувязь***. Першым аператарам стала кампанія VELCOM (13 жніўня, 2002);

— з дня адкрыцця ў БДСГА факультэта ***бізнесу і права*** (1 лістапада 2002);

— з дня ўтварэння ***Горацкай сортавыпрабавальнай станцыі*** (2002).

**15 год**

— з дня адкрыцця ***мемарыяльнай дошкі*** прафесару кафедры раслінаводства, заслужанаму работніку сельскай гаспадаркі БССР ***Пятру Мяркур'евічу Шаршнёву*** ў фае вучэбнага корпуса № 1 БДСГА (15 мая 2002);

— з дня адкрыцця ***Копцеўскага сельскага Цэнтра культуры*** і вольнага часу (1 ліпеня 2007 г.);

— з дня адкрыцця новага ***адміністрацыйнага будынка Горацкага РАУС*** (6 ліпеня 2007);

— дня адкрыцця ***аддзялення кругласутачнага знаходжання*** установы "Горацкі раённы цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва" на 60 месцаў у аграгарадку Леніна (28 снежня 2007);

— з дня прысваення вёскам ***Горы і Копцеўка статусу "аграгарадок"***(2007);

# Памятныя даты

— з дня стварэння ***народнага ансамбля “Жывіца”*** пры аўтаклубе ЦКС (2007).

**10 год**

— з дня адкрыцця ***хірургічнага корпусу*** Горацкай ЦРБ на 90 ложкаў (2 сакавіка 2012);

— з дня адкрыцця ***новага інтэрната БДСГА*** на 860 месцаў (11 жніўня 2012);

— з зня адкрыцця на будынку бібліятэкі БДСГА ***мемарыяльнай дошкі*** беларускаму пісьменніку ***Янку Купалу*** (1 верасня 2012);

— з дня адкрыцця ***Лядовай арэны і рэканструяванага стадыёна*** (7 верасня 2012);

— з дня адкрыцця новага будынку ***Горацкага раённага гісторыка-этнаграфічнага музея*** (20 верасня 2012);

— з дня правядзення ў Горках Рэспубліканскага фестывалю-кірмашу працаўнікоў вёскі ***“Дажынкі-2012”*** (21-22 верасня 2012);

— з дня адкрыцця на Цэнтральнай плошчы Горак ***памятнага знака “Сімвал дабрабыту зямлі Горацкай”*** (21 верасня 2012);






*Хірургічны корпус Горацкай ЦРБ*



*Інтэрнат № 14 БДСГА*



*Лядовая арэна*



*Горацкі раённы гісторыка -этнаграфічны музей*



*Дажынкі-2012*



*Знак “Сімвал дабрабыту зямлі Горацкай”*



*Цэнтральная плошча*



*Рудкаўшчынскі сельскі клуб*



*Мемарыяльная дошка А. М. Конанаву*

— з дня прыняцця рашэння Горацкага райсавета аб перайменаванні плошчы Леніна ў ***плошчу Цэнтральная*** (3 каст рычніка 2012);

— з дня адкрыцця ***магазін “Евроопт”*** у мікрараёне Будаўнікоў (снежань 2012);

— з дня адкрыцця новага будынка ***Рудкаўшчынскага сельскага клуба*** (2012).

**5 год**

— з дня адкрыцця ў Горках першай ***аптэкі сеткі “Планета здароўя”*** (15 лютага 2017);

— з дня адкрыцця рэканструяванага будынка ***Горацкай міжраённай арганізацыйнай структуры ДАСААФ*** (26 чэрвеня 2017);

— з дня надання Дзяржкамітэтам па навуцы і тэхналогіям Рэспублікі Беларусь ***ААТ “Тэхнапарк “Горкі”*** статусу суб’екта інавацыйнай інфраструктуры – навукова-тэхналагічны парк (21 снежня 2017);

— з дня адкрыцця мемарыяльнай дошкі ў вучэбным корпусе №8 БДСГА заслужанаму работніку вышэйшай школы, ганароваму прафесару БДСГА ***Аляксандру Мацвеевічу Конанаву*** (снеж ань 2017).










# Кнігі-юбіляры. Творы-юбіляры

## 65 год

**Шчарбатаў Г.** Шумелі пушчы (Мінск, 1957).

## 60 год

**Булахаў М. Г.** Граматыка беларускай мовы (Мінск, 1962-1966).

**Разгон Л. Э.** Волшебство популяризатора (Москва, 1962).

**Разгон Л. Э.** Своя, самая близкая (Москва, 1962).

## 45 год

**Грабчыкаў С. М.** Цяжкія выпадкі ўжывання блізкіх па гучанню слоў (Мінск, 1977).

## 40 год

**Коршунаў А. Ф.** Традыцыі літаратуры старажытнай Русі ў беларускай літаратуры : дакастрычніцкі перыяд (Мінск, 1982).

## 35 год

**Булахов М. Г.** Восточнославянские языки (Москва, 1987).

**Варюхина С.** Истоки доброты (Минск, 1987).

**Разгон Л. Э.** Наши славные символы (Москва, 1987).











# Кнігі-юбіляры. Творы-юбіляры










## 30 год

**Ліўшыц У.** Раскопкі вакол горацкага “Парнаса” : метадычны матэрыял (Магілёў, 1992).

**Разгон Л. Э.** Семь жизней (Москва, 1992).

## 25 год

**Горецкие сельскохозяйственные учебные заведения.** Очерки истории (1836-1919) (Горки, 1997).

**Горецкий лесхоз** (Горки, 1997).

**Горы** (Горкі, 1997).

**Ліўшыц У.** Літаратурны музей Максіма Гарэцкага (Орша, 1997)

**Сидоров С.** По танкам… бронебойными…! (Горки, 1997)

## 20 год

**Акадэмічны вянок** (Горкі, 2002. – Вып. 2).

**Булахов М. Г.** Опыт исторического словаря русской лингвистической терминологии (в 5 т. Минск, 2002-2005).

**Клачкоў А. В.** Тайна часу (Горкі, 2002).












# Кнігі-юбіляры. Творы-юбіляры














## 15 год

**Андрэева Л.** Жыватворная крыніца (Горкі, 2007).

**Киселев С.** Светлый вечер (Горкі, 2007).

**Кавалёва Н**. Як рыбка з вадою (Горкі, 2007).

**Клачкоў А. В.** Паланез (Горкі, 2007).

**Ковалева Н**. Нарисуем все про нас (Горки, 2007).

**Ліўшыц У. М.** Горкі: старонкі гісторыі (Горкі, 2007).

**Мажугіна В.** У салаўіных далях (Горкі, 2007).

## 10 год

**У краі бярозавых гаёў** (Магілёў, 2012).

**Андрэева Л.** На хвалях вечнасці (Мінск, 2012).

**Детликович П.** Огни над Проней (Минск, 2012).

**Лившиц В.** Евреи в Горках: судьбы и дела (Горки, 2012).

**Клачкоў А.** Думкі (Горкі, 2012).

**Мажугина В.** Душа моя (Минск, 2012).

**Сучков К.** К судьбе найду я переправу (Горки, 2012).














# Кнігі-юбіляры. Творы-юбіляры













## 5 год

**Андрэева Л.** Ніці (Мінск, 2017).

**Калиненко Л.** Детство, опаленное войной (Горки, 2017).

**Клачкоў А.** Формулы жыцця = Формулы жизни (Горкі, 2017).

**Ковалева Н.** Ангел над колыбелью (Минск, 2017).

**Ковалева Н.** Я шагаю по земле (Минск, 2017).

**Колтунов В.** Последняя четверть луны (2017).

**Лившиц В.** Гордость и слава Белорусской государственной сельскохозяйственной академии. Профессора и выпускники – академики и члены-корреспонденты (Горки, 2017. – в соавт.).

**Лившиц В.** С Горками и академией связаны судьбой (Кн. 3. Горки, 2017).

**Ліўшыц У.** Іцхак Каганаў: рыцар іўрыту з Беларусі (Горкі, 2017).















# *Памятныя даты*



*Казлоўскі А. М.*



*Міхлін Д. М.*



*Дамарацкі М. Р.*



*Фабрыстаў А. Ф.*

## *У 2022 г. спаўняецца:*

**190 год** з дня нараджэння **КАЗЛОЎСКАГА АЛЯКСАНДРА МІКАЛАЕВІЧА** (1832, Магілёўская губ. – 1890), беларускага вучонага ў галіне меліярацыі сельскагаспадарчых зямель, прафесара Горы -Горацкага земляробчага інстытута.

**135 год** з дня нараджэння **БРУЦЭРА ПЯТРА ЮР'ЕВІЧА** (1887, в. Віестэне Мадонскага пав., Латвія – 16.01.1905), рэвалюцыянера, забітага пры ўдзеле ў дэманстрацыі ў Горках 16 студзеня 1905 г. Яго імем названа адна з вуліц горада.

**135 год** з дня нараджэння **МІХЛІНА ДАВЫДА МІХАЙЛАВІЧА** (1887, в. Горы Горацкага пав. Магілёўскай губ. – 1959), доктара біялагічных навук, прафесара Інстытута біяхіміі АН СССР, заслужанага дзеяча навукі РСФСР, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны.

**130 год** з дня нараджэння **ДАМАРАЦКАГА МІКАЛАЯ РЫГОРАВІЧА** (1892, в. Палыкавічы (раней Саломенка) Магілёўскага р-на – 1965), заслужанага настаўніка БССР, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны.

**130 год** з дня нараджэння **ФАБРЫСТАВА АНТОНА ФЁДАРАВІЧА** (1892, г. Горкі – 1937), удзельніка ўстанаўлення Савецкай улады ў Горацкім павеце, гаспадарчага дзеяча.

# Памятныя даты



*Балбуноў Г. І.*

**110 год** з дня нараджэння **БАЛБУНОВА ГЕОРГІЯ ІГНАТАВІЧА** (1912, в. Каралёўка Горацкага р-на – ?), заслужанага ветэрынарнага ўрача БССР.



*Шчамялёў Г. А.*

**105 год** з дня нараджэння **ШЧАМЯЛЁВА ГЕОРГІЯ АНІСІМАВІЧА** (1917, в. Філіпава Горацкага р-на – 2005), заслужанага настаўніка БССР, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны.

**70 год** з дня нараджэння **ШАЛЮТЫ АЛЯКСАНДРА АЛЯКСЕЕВІЧА** (1952, в. Святлішча Веткаўскага р-на Гомельскай вобл. – 2011), доктара сельскагаспадарчых навук, прафесара БДСГА.



*Кажурын А. Я.*

**75 год** з дня нараджэння **КАЖУРЫНА АЛЯКСАНДРА ЯГОРАВІЧА** (1942, в. Хамінічы Горацкага р-на – 2011), самадзейнага кампазітара, паэта, члена таварыства кампазітараў Магілёўшчыны.



*Карпіцкі В. У.*

**65 год** з дня нараджэння **КАРПІЦКАГА ВАЛЯНЦІНА УЛАДЗІМІРАВІЧА** (1957, в. Куртасы Горацкага р-на), беларускага ваеннага дзеяча, генерал-маёра ўнутранай службы ў адстаўцы, заслужанага выратавальніка Рэспублікі Беларусь.

**60 год** з дня нараджэння **НАЗАРАВА ЮРЫЯ ВІКТАРАВІЧА** (1962, г. Горкі Магілёўскай вобл.), дзяржаўнага дзеяча.



*Назараў Ю. В.*

## *Студзень*



*Пугач А. М.*

**1 — 70 год** з дня нараджэння **ПУГАЧА АНДРЭЯ МІХАЙЛАВІЧА** (1.01.1947, в. Звераўшчына Баранавіцкага р-на Мінскай вобл.), кіраўніка акадэмічнага літаратурнага аб'яднання "Парнас", самадзейнага паэта.



*Персікава Т. Ф.*

**3 — 65 год** з дня нараджэння **ПЕРСІКАВАЙ ТАМАРЫ ФІЛІПАЎНЫ** (3.01.1952, г. п. Хоцімск), беларускага вучонага, доктара сельскагаспадарчых навук, прафесара БДСГА.



*Якубоўскі І. І.*

**7 — 105 год** з дня нараджэння **ЯКУБОЎСКАГА ІВАНА ІГНАТАВІЧА** (7.01.1912, в. Зайцава Горацкага пав. – 30.11.1976, Масква) маршала Савецкага Саюза, Двойчы Героя Савецкага Саюза.

**13 — 150 год** з дня нараджэння **ЗЕВІНА ІЗРАЭЛЬ-ІОСІФА** (13.01.1872, г. Горкі Магілёўскай губ. – 6.10.1926, г. Нью-Ёрк), пісьменніка на ідышы і англійскай мовах, гумарыста і выдаўца літаратуры.



*Мельнік І. І.*

**21 — 95 год** з дня нараджэння **МЕЛЬНІКА ІВАНА ІГНАТАВІЧА** (21.01.1927, в. Мікулічы Бабруйскага р-на – 28.07.2011), Героя Сацыялістычнай Працы, Ганаровага грамадзяніна Горацкага раёна, былога старшыні калгаса "Аўсянка".

**26 — 75 год** з дня нараджэння **ПЛОТКІНА АЛЯКСАНДРА МАРКАВІЧА** (26.01.1947, г. Вена, Аўстрыя), самадзейнага мастака.


*Кананаў У. А.*


*Гарэленкаў П. М.*


*Уласенка М. А.*


*Касачоў В. Д.*

**27 — 70 год** з дня нараджэння **КОНАНАВА УЛАДЗІМІРА АНТОНАВІЧА** (27.01.1952, г. Горкі), беларускага вучонага ў галіне лазернай тэхнікі.

## *Люты*

**5 — 100 год** з дня нараджэння **ГАРЭЛЕНКАВА ПЯТРА МАЙСЕЕВІЧА** (5.02.1922, в. Сахараўка Горацкага раёна – ?), педагога, заслужанага настаўніка Беларусі.

**10 — 80 год** з дня нараджэння **КУКРАША СЯРГЕЯ ПАТАПАВІЧА** (10.02.1942, в. Закальное Любанскага р-на Мінскай вобл. – снежань 2020, г. Горкі), беларускага вучонага ў галіне аграхіміі, Лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь.

**10 — 85 год** з дня нараджэння **УЛАСЕНКІ МІХАІЛА АЛЯКСАНДРАВІЧА** (10.02.1937, в. Юшкавічы Мсціслаўскага р-на), самадзейнага паэта, журналіста, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі.

**11 — 70 год** з дня нараджэння **БУШУЕВАЙ ВЕРЫ ІВАНАЎНЫ** (11.02.1952, в. В. Буда Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл.), беларускага вучонага ў галіне селекцыі і генетыкі, доктара сельскагаспадарчых навук, прафесара БДСГА.

**12 — 75 год** з дня нараджэння **КАСАЧОВА ВІКТАРА ДАНІЛАВІЧА** (12.02.1947, в. Акушкі Горацкага р-на), доктара медыцынскіх навук.


*Аляксееў А. М.*

**18 — 100 год** з дня нараджэння **АЛЯКСЕЕВА АЛЯКСАНДРА МІКАЛАЕВІЧА** (18.02.1922, в. Жарнеўка Дубровенскага р-на – 11.09.1999, г. Горкі), заслужанага настаўніка БССР.


*Круглікаў Б. Д.*

**23 — 85 год** з дня нараджэння **КРУГЛІКАВА БАРЫСА ДАВЫДАВІЧА** (23.02.1932, г. Касцюковічы Магілёўскай вобл. – 20.06.2006), былога дырэктара Горацкай ДзШМ, кіраўніка народнага духавога аркестра Горак, педагога.

**24 — 80 год** з дня нараджэння **ЛЯНЬКОВАЙ РАІСЫ КАНСТАНЦІНАЎНЫ** (24.02.1942, в. Васілёўка Хоцімскага р-на) беларускага вучонага, доктара эканамічных навук, прафесара БДСГА.

## *Сакавік*


*Маненкаў П. В.*

**3 — 125 год** з дня нараджэння **МАНЕНКАВА ПАЎЛА ВАСІЛЬЕВІЧА** (3.03.1897, в. Маслакі Горацкага пав. – 27.01.1974), доктара медыцынскіх навук, прафесара, заслужанага дзеяча навукі Татарскай АССР.


*Далжанкоў У. С.*

**3 — 70 год** з дня нараджэння **ДАЛЖАНКОВА УЛАДЗІМІРА СІДАРАВІЧА** (3.08.1952, в. Старына Горацкага р-на), грамадскага дзеяча, былога старшыні Горацкага райвыканкама.

**8 — 95 год** з дня нараджэння **МАГАЛІФА БАРЫСА ЯКАЎЛЕВІЧА** (8.03.1927, г. Берлін – 28.12.2006), музыканта, кампазітара, паэта, перакладчыка, педагога гімназіі № 1 г. Горкі.

# Памятныя даты

## Сакавік Красавік


*Глушанкоў Н. Э.*


*Капусцін І. А.*


*Жылін М. Я.*


*Кажэкін А. А.*

**10 — 145 год** з дня нараджэння **СТАЎСКАГА ІВАНА ІВАНАВІЧА** (10.03.1877, в. Аршані Горацкага пав. – 10.03.1957), удзельніка ўстанаўлення Савецкай улады, рэвалюцыянера.

**14 — 120 год** з дня нараджэння **ГЛУШАНКОВА НІЧЫПАРА ЭМАНУІЛАВІЧА** (14.03.1902, в. Зубры Горацкага р-на – 20.12.1959), ваеннага дзеяча, генерал-лейтэнанта авіяцыі.

**16 —100 год** з дня нараджэння **КАПУСЦІНА ІВАНА АЛЯКСАНДРАВІЧА** (16.03.1922, в. Мікулічы Бабруйскага р-на – 14.03.1995), былога пракурора Горацкага раёна, заслужанага юрыста Беларусі.

## *Красавік*

**4 — 85 год** з дня нараджэння **ЖЫЛІНА МІХАІЛА ЯКАЎЛЕВІЧА** (08.04.1937, в. Гарадзец Горацкага р-на), журналіста, пісьменніка, члена Саюза пісьменнікаў Расіі.

**11 — 85 год** з дня нараджэння **КАЖЭКІНА АЛЯКСАНДРА АЛЯКСЕЕВІЧА** (11.04.1937, в. Шаўнева Горацкага раёна Магілёўская вобл.), прафесара Акадэміі ваенных навук Расійскай федэрацыі, заслужанага работніка вышэйшай школы Расійскай Федэрацыі.

**14 — 70 год** з дня нараджэння **ЯНУСАВА АЛЯКСАНДРА АЛЯКСЕЕВІЧА** (14.04.1952, г. Горкі – 16.07.1970), загінуў у час баявых дзеянняў у Чэхаславакіі.



*Смаргуноў У. П.*

**16 — 85 год** з дня нараджэння **СМАРГУНОВА УЛАДЗІМІРА ПАЎЛАВІЧА** (16.04.1937, г. Мсціслаў – 17.06.1994, г. Горкі), грамадскага дзеяча, былога старшыні Горацкага райвыканкама (1975-1980).



*Фрэйдзін М. З.*

**24 — 90 год** з дня нараджэння **ФРЭЙДЗІНА МАКСА ЗАЛМАНАВІЧА** (24.04.1932, г. Горкі), прафесара, заслужанага эканаміста БССР.

## *Май*

**4 — 135 год** з дня нараджэння **ЕРАФЕЕВА** (сапр. прозвішча Далжанкоў) **ФАМЫ ПРАКОФ'ЕВІЧА** (4.05.1887, в. Аўсянка Горацкага пав. – 16.01.1905), рэвалюцыянера, забітага пры ўдзеле ў дэманстрацыі 16 студзеня 1905 г. ў Горках.

**5 — 75 год** з дня нараджэння **КАПУСЦІНА МІКАЛАЯ КУЗЬМІЧА** (5.05.1947, в. Панкратаўка Горацкага р-на – 2006, г. Горкі), беларускага вучонага ў галіне сельскай гаспадаркі, доктара сельскагаспадарчых навук, прафесара.



*Кідалінскі М. М.*

**7— 115 год** з дня нараджэння **КІДАЛІНСКАГА МІКАЛАЯ МІХАЙЛАВІЧА** (07.05.1907, г. Горкі Магілёўскай губ. – 15.10.1952), ваеначальніка, генерал-маёра авіяцыі.

**8 — 65 год** з дня нараджэння **КУЗЬМІЦКАГА АЛЯКСАНДРА ВАСІЛЬЕВІЧА** (8.05.1957, г. п. Кіраўск Магілёўскай вобл.), вучонага, доктара эканамічных навук, прафесара БДСГА.



*Кузёмкіна Г. С.*

**15 — 90 год** з дня нараджэння **ШАРСНЁВА ПЯТРА МЯРКУР'ЕВІЧА** (15.05.1932, в. Курбатаўшчына Веліжскага р-на Смаленскай вобл. – 2005, г. Горкі), заслужанага работніка сельскай гаспадаркі, былога дырэктара вучгаса, прафесара.



*Пракопаў В. Ц.*

## *Чэрвень*

**1 — 95 год** з дня нараджэння **ВАСІЛЬЕВА ВАСІЛЯ ІВАНАВІЧА** (1.06.1927, в. Тушавая Горацкага р-на – 2010, г. Мінск), беларускага мастака, педагога, члена Саюза мастакоў Беларусі.

**11 — 90 год** з дня нараджэння **КУЗЁМКІНАЙ ГАННЫ СЯМЁНАЎНЫ** (11.06.1932, в. Цёмналессе Чавускага р-на – 10.11.2004, г. Горкі), заслужанай настаўніцы БССР.



*Клачкоў А. В.*

**12 —70 год** з дня нараджэння **ПРАКОПАВА ВІКТАРА ЦІМАФЕЕВІЧА** (12.06.1952, в. Паляшчыцы Горацкага р-на), заслужанага юрыста Расійскай Федэрацыі.

**30 —70 год** з дня нараджэння **КЛАЧКОВА АЛЯКСАНДРА ВІКТАРАВІЧА** (30.06.1952, в. Воўкавічы Чавускага р-на), вучонага ў галіне механізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці, доктара тэхнічных навук, самадзейнага паэта.



*Цітовіч І. С.*

**30 —100 год** з дня нараджэння **ЦІТОВІЧА ІГАРА СЯРГЕЕВІЧА** (30.06.1917, г.Горкі – 12.06.1985), беларускага вучонага ў галіне машынабудавання, заслужанага дзеяча навукі і тэхнікі БССР.


Саскевіч П. А.


Грыгор'еў І. Л.


Пятроў М. С.


Сідараў С. Ф.

## *Ліпень*

**6 — 85 год** з дня нараджэння **КОВЕЛЯ ПАЎЛА ВАСІЛЬЕВІЧА** (06.07.1937, в. Осава Докшыцкага р-на – чэрвень 2014, г. Горкі), вучонага, доктара эканамічных навук, прафесара.

**10 — 65 год** з дня нараджэння **САСКЕВІЧА ПАЎЛА АЛЯКСАНДРАВІЧА** (10.07.1957, в. Млынок Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл.), доктара сельскагаспадарчых навук, былога рэктара БДСГА.

**15 —100 год** з дня нараджэння **ГРЫГОР’ЕВА ІЛЛІ ЛЯВОНАВІЧА** (15.07.1922, в. Селішча Жаркаўскага р-на, Калінінскай вобл. – 1.05.1994, г. Масква), Героя Савецкага Саюза, Ганаровага грамадзяніна горада Горкі.

**16 —85 год** з дня нараджэння **ПЯТРОВА МІКАЛАЯ СЦЯПАНАВІЧА** (16.07.1937, в. Адамаўка Горацкага р-на), фізіка-тэарэтыка, доктара фізіка-матэматычных навук, прафесара.

## *Жнівень*

**14 — 100 год** з дня нараджэння **СІДАРАВА СЦЯПАНА ФЁДАРАВІЧА** (14.08.1922, в. Чартоўшчына (цяпер Сонечная) Дрыбінскага р-на – 28.11.1999), члена Саюза журналістаў СССР, карэспандэнта горацкай раённай газеты “Ленінскі шлях”.

**14 — 85 год** з дня нараджэння **СІНАЙСКАГА ЛЕАНАРДА ГЕОРГІЕВІЧА** (14.08.1937, г. Ленінград – 30.11.2018, г. Горкі), самадзейнага мастака.

**17 — 115 год** з дня нараджэння **КАВАЛЯ ВАСІЛЯ** (17.08.1907, в. Сава, Горацкага раёна – 29.10.1937), беларускага пісьменніка.

**20 — 85 год** з дня нараджэння **МІРОНЧЫКАВА МІХАІЛА ВАСІЛЬЕВІЧА** (20.08.1937, в. Горы Горацкага р-на – люты 2008, г. Горкі), заслужанага работніка гандлю і грамадскага харчавання.

**27 — 80 год** з дня нараджэння **ЗЕЛЯНОЎСКАГА АНАТОЛЯ АНТОНАВІЧА** (27.08.1942, г. Горкі), беларускага вучонага ў галіне меліярацыі, заслужанага меліяратара БССР.

**28 — 95 год** з дня нараджэння **ЛАТЫПАВА АНВАРБЕКА ЗАКІРАВІЧА** (28.08.1927, г. Петрапаўлаўск, Казахстан – 19.11.2010, г. Горкі), доктара сельскагаспадарчых навук, прафесара, заслужанага работніка адукацыі Беларусі.



*Сінайскі Л. Г.*



*Каваль В.*



*Мірончаыкаў М. В.*



*Зеляноўскі А. А.*



*Латыпаў А. З.*


Барушка А. М.


Леўшанкоў А. І.


Каўцэвіч М. М.


Фомчанка Р. У.

**28 — 85 год** з дня нараджэння **ГЕРАСІМАВА АЛЯКСАНДРА ПАНФІЛАВІЧА** (28.08.1932 – 17.01.2011, в. Камень Гжацкага р-на Смаленскай вобл.), заслужанага работніка сельскай гаспадаркі, былога старшыні СЗАТ "Горы".

**31 — 115 год** з дня нараджэння **БАРУШКІ АЛЯКСАНДРА МІХАЙЛАВІЧА** (31.08.1907, ст. Пагодзіна (г. Горкі) Магілёўскай вобл. – 27.06.1981, г. Санкт-Пецярбург), канструктара падводнай марской зброі, Лаўрэата Сталінскай прэміі.

## *Верасень*

**4 — 90 год** з дня нараджэння **ЛЕЎШАНКОВА АНАТОЛЯ ІЛЫЧА** (4.09.1932, в. Каменка Горацкага раёна), доктара медыцынскіх навук (1982), прафесара, заслужанага работніка вышэйшай школы Расійскай Федэрацыі.

**5 — 125 год** з дня нараджэння **КАЎЦЭВІЧА МІКАЛАЯ МІКАЛАЕВІЧА** (5.09.1897, г. п. Любча Навагрудскага р-на – 1.07.1949), беларускага фізіка, прафесара, заслужанага дзеяча навукі БССР, былога рэктара БСГА.

**5 — 100 год** з дня нараджэння **ФОМЧАНКІ РЫГОРА УЛАДЗІМІРАВІЧА** (5.09.1922, в. Рэкатка Горацкага р-на – 1986), заслужанага ўрача БССР, удзельніка партызанскага руху ў Горацкім раёне ў гады Вялікай Айчыннай вайны.


*Шалюта Б. В.*

**11 — 70 год** з дня нараджэння **ШАЛЮТА БРАНІСЛАВЫ ВАСІЛЬЕЎНЫ** (11.09.1952, в. Хатомель Столінскага р-на Брэсцкай вобл.), доктара сельскагаспадарчых навук, прафесара БДСГА.


*Наймарк Л. Б.*

**26 — 110 год** з дня нараджэння **НАЙМАРКА ЛАЙЗЕРА БЕНЦЫЯНАВІЧА** (26.09.1912, г. Горкі – 13.02.1994), беларускага вучонага, доктара сельскагаспадарчых навук, прафесара БСГА.

**28 — 160 год** з дня нараджэння **КАСОВІЧА ПЯТРА САМСОНАВІЧА** (28.09.1862, г. Горкі Магілёўскай вобл. – 26.08.1915), расійскага аграхіміка, сапраўднага стацкага саветніка, прафесара.


*Касовіч П. С.*

## *Кастрычнік*

**31— 125 год** з дня нараджэння **НОВІКА АРЦЕМІЯ ІВАНАВІЧА** (31.10.1897, в. Селішча Слуцкага пав. (цяпер Слуцкі р-н) Мінскай губ. – 20.08.1994, г. Горкі), заслужанага дзеяча навукі БССР, доктара ветэрынарных навук, прафесара БСГА.

## *Лістапад*

**145 год** з дня нараджэння **ГУРВІЦА ІЗРАЭЛЯ-ЗАЛМАНА** (лістапад 1872, Горкі Магілёўскай губ. – 1955, Нью-Ёрк), яўрэйскага пісьменніка.


Сцешыц Л. І.

**4 —** **85 год** з дня нараджэння **СЦЕШЫЦА ЛЯВОНА ІОСІФАВІЧА** (4.11.1937 в. Доўгае Салігорскага р-на – 2009), вучонага ў галіне эканомікі, заслужанага работніка народнай адукацыі [БДСГА].

**11 —** **215 год** з дня нараджэння **ЦАЛІНСКАГА БАГДАНА (ЙАГАН-ГОТЛІБ) АНДРЭЕВІЧА** (11.11.1812 – 1886, г. Пецярбург), аграномa, педагога, першага прафесара і дэкана (інспектара) Горы-Горацкага земляробчага інстытута, лаўрэата Дзямідаўскай прэміі.


Церахаў І. А.

**22 —** **115 год** з дня нараджэння **ЦЕРАХАВА ІОСІФА АЛЯКСЕЕВІЧА** (22.11.1907, в. Шапялёўка Горацкага р-на Магілёўскай вобл. – 27.05.1983), арганізатара сельскагаспадарчай вытворчасці, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны.

## *Снежань*


Піліпенка П. А.

**16 —** **125 год** з дня нараджэння **ПІЛІПЕНКІ ПАЎЛА АНАНЬЕВІЧА** (16.12.1897, с. Анікавічы Горацкага пав. – 1975), ваеннага дзеяча, генерал-маёра артылерыі.

# Калі нарадзіліся вёскі Горацкага раёна

**500 год** з дня заснавання вёскі ***Хамінічы*** (1522).

**400 год** з дня заснавання вёсак: ***Азаравічы*** (с. Сапрыкі), ***Андзекалава***, ***Воўкаўшчына***, ***Добрая***, ***Зубры*** (Слабада Зуброва), ***Ермакі***, ***Калацілы*** (Калацілава), ***Лебедзева***, ***Лукі***, ***Вялікая Каралёўка*** (с. Каралёва), ***Малая Каралёўка*** (в. Ваўкалакі), ***Кузавіна*** (с. Сутокі), ***Масалыкі***, ***Машкова***, ***Мікуліна***, ***Мядзведзева*** (с. Мядзведкава), ***Радзівонаўка***, ***Рэкатка***, ***Саракапуды*** (с. Саракапуты), ***Славікі*** (в. Словікі), ***Турышчава***, ***Тушкава***, ***Харкаўка***, ***Ходаравічы***, ***Чурылава***, ***Шаўнева***, ***Ярцаўка*** (Ярцава). Яны ў той час ўваходзілі ў склад маёнтка Вялікія Горы (1622).

**375 год** з дня заснавання вёсак: ***Зайцава*** (ўзгадваецца ў складзе маёнтка Раманава), ***Казлы***, ***Кастюшкава***, (Трыгубава), ***Куртасы***, ***Майсеева***, ***Пераможная*** (с. Паўзухі), ***Сафонава*** (с. Пузікі), ***Стараселле***, ***Старына***, ***Сысоева***, ***Шалаханаўка*** (1647).

**375 год** з дня заснавання вёскі ***Андрухі*** (с. Андрукі) у Аршанскім павеце (1667).

**280 год** з дня заснавання вёсак ***Рудня*** і ***Пясочня*** (Пясечна), як сёлы Копцеўскай воласці (1742).

**250 год** з дня заснавання вёсак ***Паташы*** (Поташа), ***Тушавая***, ***Ходараўка*** ў складзе Аршанскага павета (1772).

**245 год** з дня заснавання вёсак: ***Асіповічы***, ***Бацвіннева***, ***Дружная*** (Каравяк), ***Ермалоўка***, ***Жаўлачоўка***, ***Кукшынава*** (в. Кукшына), ***Ліхачова***, ***Логінава***, ***Любіж***, ***Малыя Анікавічы***, ***Міколенка*** (в. Мікулінка), ***Напраснаўка*** (в. Красноўка), ***Палёнка***, ***Палішына***, ***Першыно***, ***Светлая*** (да 1934 года Асталопава), ***Ходараўка***, ***Целяшоўка*** (в. Целяшоў), ***Чысцікі***. Гэтыя вёскі знаходзіліся ў складзе Аршанскага павета (1777).

**160 год** з дня заснавання вёскі ***Шацілаўка***, як маёнтка (1862).

**125 год** з дня заснавання вёсак ***Лянполле***, ***Марозава Вялікае*** (як пасёлак у складзе Горскай воласці), ***Ферма*** (як ферма Міхайлавічы) (1897).

# Метадычныя парады бібліятэкарам

2022 год адзначаны шматлікімі знамянальнымі і памятнымі датамі з гісторыі Горацкага краю. Шэраг прадпрыемстваў і ўстаноў горада адзначаць свае юбілейныя даты. Таксама грамадскасць нашага края будзе адзначаць юбілейныя даты нашых слаўных ураджэнцаў і землякоў.

З гэтай мэтай прапануем правесці наступныя мерапрыемствы краязнаўчай тэматыкі:

***прэзентацыю "Нашы землякі ў свеце":*** А. М. Барушка, М. Я. Жылін, А. А. Зеляноўскі, А. А. Кажэкін, В. Д. Касачоў, П. С. Касовіч, У. А. Конанаў, А. І. Леўшанкоў, П. В. Маненкаў, М. Д. Міхлін, В. Ц. Пракопаў, М. С. Пятроў, І. С. Цітовіч.

***вечары-партрэты***, прысвечаныя:

***заслужаным работнікам:*** А. М. Аляксееву, П. М. Гарэленкаву, М. Р. Дамарацкаму, І. А. Капусціну, Г. С. Кузёмкінай;

***вучоным:*** В. І. Бушуевай, А. М. Казлоўскаму, М. К. Капусціну, М. М. Каўцэвічу, А. В. Клачкову, П. В. Ковелю, С. П. Кукрашу, А. З. Латыпаву, Р. К. Ляньковай, А. І. Новіку, Т. Ф. Персікавай, М. З. Фрэйдзіну, Б. А. Цалінскаму, І. С. Цітовічу, П. М. Шарснёву;

***грамадскім дзеячам:*** У. С. Далжанкову, Ю. В. Назараву, У. П. Смаргунову;

***працаўнікам сельскай гаспадаркі:*** А. П. Герасімаву, Герою Сацыялістычнай Працы І. І. Мельніку, Л. Б. Наймарку, І. А. Церахаву;

***урокі мужнасці***, прысвечаныя ўдзельнікам рэвалюцыйных падзей, Вялікай Айчыннай вайны, рэгіянальных баявых дзеянняў: П. Ю. Бруцэру, Н. Э. Глушанкову, І. Л. Грыгор'еву, Ф. П. Ерафееву, М. М. Кідалінскаму, П. А. Піліпенку, В. Ц. Пракопаву, І. І. Стаўскаму, Г. А. Шчамялёву, А. Ф. Фабрыставу, Р. У. Фомчанку, І. І. Якубоўскаму і інш.

***вечар "Таленты ад роднай зямлі"***, прысвечаны В. Кавалю, А. Клачкову, М. Уласенку;

***літаратурна-музычныя вечары,*** прысвечаныя жыццю і творчасці ***пісьменнікаў:*** І. Гурвіцу, М. Жыліну, А. Зевіну, В. Кавалю, А. Клачкову, С. Сідараву, А Пугачу, М. Уласенку;

***мастакоў:*** В. Васільева, А. Плот кіна, Л. Сінайскага;

***музыкантаў:*** А. Каж урына, Б. Круглікава, Б. Магаліфа;

***завочныя падарожжы*** “Край, дзе я жыву” (па бібліятэках-юбілярах раёна, Горацкаму ільнозаводу, Горацкаму маслазаводу, Ленінскай дзіцячай школе мастацтваў і мастацкіх рамёстваў, Каменскай СШ, музею-кабінеце Максіма Гарэцкага пры БДСГА, раённаму гісторыка-краязнаўчаму музею, аграгарадкам Горы і Копцеўка);

***краязнаўчыя гадзіны*** “Гартаючы старонкі гісторыі краю”, прысвечаныя 70-годдзю народнага літаратурнага аб’яднання ***“Парнас”***, 65-годдзю заснавання Горацкага раённага цэнтра творчасці дзяцей, 55-годдзю ансамбля ***“Радасць”*** пры БСГА, 40-годдзю дзіцячага парка, 30-годдзю з дня адкрыцця ***Каменскай сярэдняй школы***, 30-годдзю з дня прысваення звання “народны” ***ансамблю беларускай песні “Весялосць”***, 30-годдзю народнага аматарскага аб’яднання ***“Мастацтва”***, 25-годдзю народнага хора ветэранаў вайны і працы ***“Спадчына”,*** 25-годдзю народнага аматарскага аб’яднання па саломапляценні ***“Скарбніца”***, гадавінам устаноўкі помніка навуковым супрацоўнікам, студэнтам і служачым БДСГА, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, помнікаў загінуўшым землякам і савецкім воінам у аграгарадках Аўсянка, Горы, 10-годдзю з дня адкрыцця на Цэнтральнай плошчы Горак памятнага знака “Сімвал дабрабыту зямлі Горацкай” і інш.

***краязнаўчыя віктарыны*** “Ці ведаеце вы свой край?”;

***бібліятэчныя выставы*** кніг-юбіляраў ураджэнцаў краю і мясцовых аўтараў;

***інфармацыйныя лісткі*** да дня нарадж эння юбіляраў;

***бібліяграфічныя агляды***;

***бенефіс адной кнігі–юбіляра і інш.***

*Каляндар*
*знамянальных*
*і памятных дат*
*па Горацкаму раёну*
*на 2022 год*

Складальнік: Н. М. Дылькова

Адказны за выпуск: І. А. Пачэкіна

Надрукавана на аргтэхніцы цэнтральнай бібліятэкі
імя М. Гарэцкага

Горацкая цэнтральная бібліятэка імя М. Гарэцкага.
Вул. Якубоўскага, 40, 212410, Горкі.
***E-mail*: gorkilib@tut.by.**
www.**lib-gorki.mogilev.by**



*Горкі 2021*